**І. І. Шматкова**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*e-mail:* i.shmatkova@gmail.com

## МАТЫЎ АДЗІНОТЫ Ў ЛІРЫЦЫ ЕЎДАКІІ ЛОСЬ

У дакладзе разглядаецца ўвасабленне матыва адзіноты ў лірыцы выбітнай беларускай паэтэсы другой паловы XX ст.; аналізуецца ўплыў некаторых біяграфічных фактаў на творчасць аўтаркі; вылучаюцца мастацкія адметнасці рэпрэзентацыі дадзенай тэмы ў яе паэзіі.

*Ключавыя словы:* Еўдакія Лось; матыў адзіноты; жаночая лірыка; жыццёвы і творчы шлях; мастакая адметнаць.

**И. И. Шматкова**

*Белорусский государственный университет*
*Минск, Республика Беларусь*
*e-mail:* i.shmatkova@gmail.com

## МОТИВ ОДИНОЧЕСТВА В ЛИРИКЕ ЕВДОКИИ ЛОСЬ

В докладе рассматривется воплощение мотива одиночества в лирике выдающейся белорусской поэтессы второй половины XX в.; анализируется влияние некоторых биографических фактов на творчество автора; выделяются художественные особенности репрезентации данной темы в её поэзии.

*Ключевые слова:* Евдокия Лось; мотив одиночества; женская лирика; жизненный и творческий путь; художественная особенность.

**I. I. Shmatkova**

*Belarusian State University,*
*Minsk, Republic of Belarus*
*e-mail:* i.shmatkova@gmail.com

## THE MOTIF OF LONELINESS IN THE LYRICS OF EVDOKII LOS'

The report examines the motive of loneliness in the lyrics of the outstanding Belarusian poetess of the second half of the twentieth century; the influence of some biographical facts on the author's work is analyzed; the artistic features of the representation of this theme in her poetry stand out.

*Key words:* Eмdokia Los'; the motive of loneliness; female lyrics; life and creative path; artistic to mark.

Еўдакія Якаўлеўна Лось (1929 – 1977) – вядомая беларуская паэтэса, пісьменніца. Е. Лось стала адной з родапачынальніц самабытнай плыні беларускай жаночай паэзіі, якая ярка раскрылася ў 70–80-я гг. XX ст.

(Я. Янішчыц, В. Вярба, Н. Мацяш, Т. Бондар, Р. Баравікова, Г. Каржанеўская, В. Коўтун і інш.).

Е. Лось адносіцца да пакалення пісьменнікаў-“дзяцей вайны”, якое прыйшло ў літаратуру ў канцы 1950 – 1960 гг. (У. Караткевіч, Н. Гілевіч, Р. Барадулін, П. Макаль, В. Зуёнак, Г. Бураўкін, М. Стральцоў, А. Вярцінскі і інш.). Згаданае пакаленне мае яшчэ адно азначэнне “філалагічнае”, амаль усе пісьменнікі мелі філалагічную адукацыю.

Е. Лось пражыла хоць і нядоўгае, але вельмі насычанае на падзеі жыццё. Яна шмат вучылася: закончыла Глыбоцкае педвучылішча (1945 – 1948 гг.), Мінскі педінстытут імя М. Горкага (1948 – 1955 гг.), Вышэйшыя літаратурныя курсы пры СП СССР у Маскве (1958 – 1960 гг.); шмат працавала: у газеце “Зорька”, у Вучпедвыдавецтве БССР, газеце “Звязда”, часопісе “Работніца і сялянка”, з 1975 г. – галоўны рэдактар часопіса “Вясёлка”; выдала шмат паэтычных кніг: “Сакавік” (1958), “Палачанка” (1962), “Людзі добрыя” (1963), “Хараство” (1965), “Яснавокія мальвы” (1967), “Перавал” (1971), “Галінка з яблыкам” (1973), “Лірыка ліпеня” (1977) і інш.; вельмі любіла падарожнічаць: аб’ездзіўшы ўсю Беларусь, яна ў складзе дэлегацый наведала Латвію, Літву, Азербайджан, Украіну, Чэхаславакію, Венгрыю; яна мела шмат сяброў… Але негледзячы на ўсё гэта, усё гэта яна адчувала сябе адзінокай і была не задаволена сваім лёсам, сябе яна называла “жанчынай без жаноцкай долі..” [1, с. 123].

У творчасці Е. Лось скразной ніткай праходзіць матыў адзіноты (вершы “Адна”, “Мне добра, калі я адна…”, “У адзіноце, па-за светам…” і інш.). Адна з яе сяброўак Т. Бондар успамінала: *“Паэтэса не была адзінокай – яна была страшна адзінокай!”* [2, с. 10].

Уласная адзінота выклікала незвычайную спагадлівасць да людзей. Сябра-рэдактар А. Х. Асіпенка, адзначаючы разам з упартым, яршыстым, незгаворлівым характарам незвычайна “чуллівае сэрца” Е. Лось, успамінаў выпадак, “як у доме творчасці “Караліўчавічы” яна запрасіла яго ў пакой і паказала ліст ад зняволенага строгага рэжыму, сказала: *“Ён вельмі адзінокі… У гэтым я не сумняваюся. Гэта шчыра… Трэба ведаць, адчуваць, як страшна быць адзінокім… Тады захочацца і паспагадаць…”* [3, с. 44]. Пасля з’явіўся верш “Пісьмо… А ў ім такія словы!”: *“Ты адзін.. // Адзін у сэрцы ўсхваляваным, // табе – зямліну белы свет!...” // І нёс бы вечар закаханы // абодвух у дзівосны свет… // А тут – зусім другая доля: // і даль, і дрот перасцярог… // Мой друг, каханню трэба воля – // чаму ж ты волю не ўбярог?!”* [1, с. 272].

У гэтага верша цікавая гісторыя, гісторыя кахання. Пры аналізе перапіскі Е. Лось з сябрамі і калегамі, нам сустрэліся анкетныя дадзеныя ад 23.02.1975 аб яе мужы і сыне: “В разводе, муж, отец сына Таболо Олег Иванович. Живёт в Минске. 1929 г. р. Сын Таболо Дмитрий Олегович,

род. 10.07.1963" [4]. Яе муж у свой час напісаў успаміны былога палітвязня "Мой жыццяпіс", якія ўбачылі свет пасля яго смерці [5]. У гэтай аўтабіяграфіі ёсць цікавы ўспамін, калі А. Табола, знаходзячыся ў Эстоніі і сумуючы па радзіме, чытаў газету "Звязда": *"...у адным з нумароў я прачытаў артыкул знаёмай мне па педвучылішчы дзяўчыны [Е. Лось – І.Ш.]. Мы не бачыліся з часу майго арышту... Праз адрасны стол даведаўся, дзе яна жыве. Напісаў ліст <...> Праз некаторы час атрымаў адказ..."* [5, с. 14]. З успамінаў даведваемся, што Е. Лось прапанавала вярнуцца яму на радзіму. Пасля яны ажаніліся, – *"дапамаглі пачуцці, якія закладаліся яшчэ ў Глыбоцкім педвучылішчы"* [5, с. 15].

Як адны з самых шчаслівых дзён паэтэса ўспаміналі гады, калі яна выйшла замуж, нарадзіла сына. Гэты перыяд у яе жыцці працягнуўся, на жаль, нядоўга. Яе каханне пацярпела крах, і яна вымушана была застацца адна са сваім маленькім сынам.

Зведаўшы на ўласным лёсе ўсе адценні гэтага пачуцця, яго розныя псіхалагічныя калізіі паэтэса адлюстрала ў вершах пра каханне. Любоўныя вершы ў зборніках Е. Лось, выдадзеных пачынаючы з 1965 г., – маюць у асноўным драматычны характар. Е. Лось выказвае і тамленне, і нараканне, і боль – усю напружанасць закаханай душы: *"Чаму з табой не выйшла, не прайшла?// Чаму замерлі словы на губах? // Чаму цябе я далям аддала // І той, што ходзіць па маіх слязах!..."* [6, с. 67]. Гэты верш кранае спавядальнай даверлівасцю, асаблівай пачуццёвасцю і эмацыянальнай ацэначнасцю [7].

Пасля расстання з мужам адзінота агарнула паэтэсу і амаль не адпускала яе са сваіх ціскоў да канца жыцця. Лірычная гераіня яе вершаў з гэтага часу, у асноўным, адзінокая жанчына: *"Адна душой на белым свеце // Жанчына нешчаслівая! <...> Адной жанчыне жыць нягожа – // Журыцца, // сутуліцца. // Не цешыць дом, прыбраны чыста, // Нацёртыя паркеціны. // Залішне ціха і ўрачыста // Для гаваркой кабеціны!" (верш "Адна", 1966)* [1, с. 123]

Выжыць у адзіноце паэтэсе дапамагаў сын. Сыну Е. Лось прысвяціла вельмі шмат вершаў ("Маці і сын", "Сынок, сынок…", "Сынку", "Сынава доля" і інш.): "*Сынок, сынок, // Бялюткі бацянок!... // Як дзякаваць табе, // што ты ратуеш // ад адзіноты, ад нядобрых дум… (верш "Сынок, сынок…", 1970)* [1, с. 136]. Любоў да сына на нейкі час лекавала адзінокую душу паэтэсы, нават у адзіноце яе лірычная гераіня адкрыла для сябе станоўчае: *"Мне добра, калі я адна, // адна ад цямна да цямна, // Я тады адчуваю паўней, / я тады разумею значней. // І "замкаў" тваіх не буру, // і нічога ў людзей не бяру…" (верш "Мне добра, калі я адна…", 1970)* [1, с. 164].

З цягам часу паэтэса, здаецца, навучылася жыць адна, цешыцца цёплай размове з сябрам-калегам: *“У адзіноце, па-за светам, // па-за маланкай-перуном // люблю параіцца з паэтам, / з пакутнікам-гавруном…” (верш “У адзіноце, па-за светам…”, 1974)* [1, с. 248].

На жаль, у стане экзістэнцыйнага спазнання сэнсу жыцця і з усведамленем асабістага прызначэння Е. Лось давялося пражыць нядоўга. Цяжка захварэўшы, у бальнічнай палаце яна стварае свой шчымлівы “Бараўлянскі сшытак” (1977), асноўным творам якога стала паэма “З белых пялёсткаў”. У форме трох лістоў – і зварот, і споведзь, і успаміны. Лірычная гераіня ўспамінае пражытыя светлыя дні, аналізуе памылкі, шкадуе аб няздзейсненым, і разумее, што сэнс жыцця – у самім жыцці, і ад гэтага разумення паэтэса нарэшце адчувае сябе шчаслівай, хоць і на вельмі кароткі час: *“Пасткрыптум: // шчасце ўсё-ткі наганяе… // Калі ж яго адразу атрымаць, // калі яно гатовае бывае, // тады чаго істоце дасягаць?.. // Сядзець за шчасцем, як за самаварам, // і песеньку мурлыкаць у вусы?*” *(паэма “З белых пялёсткаў”, 1977)* [1, с. 354]. Жарт у апошніх радках надае яшчэ большую шчымлівасць агульнаму сумнаму настрою паэмы.

Е. Лось, зведаўшы на сваім жыццёвым шляху пакуты адзіноты, увасобіла ў лірычнай творчасці ўсе яе адценні. Творчасць паэтэсы – лірычная споведзь жанчыны пра нялёгкі час і сваё пакаленне, яе вершаваны радок вылучаюцца шчырасцю, адкрытасцю, канкрэтна-рэчыўнай, непасрэдна-эмацыянальнай паэтыкай і лірыка-апавядальным стылем.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Лось, Е. І каласуе даўгалецце / Е. Лось. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 367 с.
2. Бондар, Т. Успаміны пра Е. Лось / Т. Бондар // БДАМЛМ. – Ф. 141. Воп. 3. Спр. 253. Арк. 8–10.
3. Асіпенка, А. Х. Успаміны пра Е. Лось, 1970-я гг. / А. Х. Асіпенка // БДАМЛМ. – Ф. 141. Воп. 3. Спр. 251. Арк. 42–50.
4. Адамскі, Я. С. Успаміны пра Е. Лось / Я. С. Адамскі // БДАМЛМ. – Ф. 141. Воп. 3. Спр. 250. Арк. 10.
5. Табола, А. І. Мой жыццяпіс [Электронны рэсурс] / А. І. Табола // Veritas. – 2004. – № 1(2). – С. 8–15. – Рэжым доступу: http://pdf.kamunikat.org/17690-1.pdf. – Дата доступу: 30.01.2021.
6. Лось, Е. Хараство: лірыка / Е. Лось. – Мінск : Беларусь, 1965. – 131 с.
7. Шматкова, І. І. Беларуская жаночая паэзія другой паловы ХХ стагоддзя [Электронны рэсурс] / І. І. Шматкова. – Мінск : РІВШ, 2017. – 144 с. – Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/187738/1/Bel_zhan_poesia_20.pdf. – Дата доступу: 30.01.2021.